# Чым жывуць землякі

*Супрацоўнікі сектара краязнаўства Мазырскай цэнтральнай раённай бібліятэкі імя А. С. Пушкіна зладзілі цікавую акцыю. І ў нашых наведвальнікаў з'явілася ўнікальная магчымасць здзейсніць прэс-турнэ «Чым жывеце, землякі?».*

Мы вырашылі сабраць пад адной вокладкай усе газеты раённых цэнтраў Гомельскай вобласці, 85-годдзе стварэння якой адзначаецца сёлета.

Кожнае друкаванае выданне мае сваю гісторыю, у кожнай газеце чытачы знаходзяць цікавую для сябе публікацыю. Нават назвы раённых газет выклікаюць цікавасць: «Маяк Палесся», «Зара над Сожам», «Прыпяцкая праўда», «Дняпровец», «Жыццё Палесся» і інш. Многія з іх маюць сваю электронную версію. Але для аматараў папяровага варыянту газет мы падрыхтавалі гэтую падшыўку.

І яна карыстаецца папулярнасцю сярод чытачоў! Бо многія мазыране – гэта выхадцы з іншых месцаў, якія воляй лёсу апынуліся на нашай зямлі.

*Аксана КУЗОЎКІНА*

